УДК 82:398.91

***Б.А. Крук***
*УА «Мазырскі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя І.П. Шамякіна»*
*Мазыр, Рэспубліка Беларусь*
***Л.Л. Капаткова***
*УА «Гомельскі дзяржаўны педагагічны каледж імя Л.С. Выгоцкага»*
*Гомель, Рэспубліка Беларусь*

# ФАРМІРАВАННЕ МАРАЛЬНА-ЭТЫЧНЫХ ЯКАСЦЕЙ ВУЧНЯЎ СРОДКАМІ ПРЫКАЗКІ НА ЎРОКАХ ЛІТАРАТУРНАГА ЧЫТАННЯ

*Аннотация. В статье представлены возможности использования разнообразных форм познавательно-воспитательной работы с пословицами, описано содержание приёмов анализа пословиц в процессе изучения художественного произведения, рассматривается проблема формирования нравственно-этических качеств учащихся на уроках литературного чтения.*

*Ключевые слова: воспитание, литературное чтение (чтение), нравственно-этическое качество, пословица, форма организации познавательно-воспитательной работы.*



МГПУ им. И.П.Шамякина

***B.A. Kruk***
*Mozyr State Pedagogical University named after I.P Shamyakin*
*Mozyr, The Republic of Belarus*
***L.L. Kapatkova***
*Gomel State Pedagogical College named after L.S. Vygotsky*
*Gomel, The Republic of Belarus*

## THE FORMATION OF MORAL AND ETHICAL QUALITIES BY MEANS OF PROVERBS IN LITERATURE

*Annotation. The possible use of various ways of nurturing and educational activity with proverbs are represented, the content of analyzing technique of proverbs in the process of an artistic work studying is described, the problem of formation of moral and ethical qualities of learners in Literature is considered in the article.*
*Keywords: nurturing; Literature; moral and ethical quality; proverbs; way of organizing nurturing and educational activity.*

Навучанне літаратуры непарыўна звязана з культурай народа, бо сама літаратура з’яўляецца неад’емнай часткай нацыянальнай культуры. Таму ў курс літаратурнага чытання ўжо ў пачатковай школе ўводзіцца нацыянальна-культурны кампанент, арыентаваны на засваенне вучнямі эстэтычнага, маральна-этычнага, гістарычнага вопыту народа.

Побыт беларусаў, традыцыі і культура, назіральнасць, гаспадарлівасць, гасціннасць, імкненне быць справядлівым яскрава праяўляюцца ў прыказках, своеасаблівым фальклорным жанры. З другога боку, у беларускіх прыказках асуджаюцца розныя заганы чалавека: прагнасць і зайздрайсць, гультайства, несправядлівасць у адносінах да іншых людзей і інш.

Прыказкі шырока пададзены ў вучэбных дапаможніках па літаратурным чытанні, бо гэта прыдатны матэрыял для навучання, развіцця маўлення і выхавання вучняў. І многія навучальна-выхаваўчыя аспекты выкарыстання прыказак ужо знайшлі асвятленне ў метадычнай літаратуры. Л.В. Ярмольчык разглядае прыказкі як дзейсны сродак развіцця маўлення вучняў [1], Н.С. Латышава апісвае гульні з прыказкамі і прымаўкамі [2], на магчымасцях выкарыстання прыказак на ўроках мовы, уроках-святах і пазакласных мерапрыемствах акцэнтуюць ўвагу настаўнікаў Г.М. Канцавая [3] і А.П. Чарнагрудава [4].

Прысутнасць нацыянальнага элемента ў прыказках сведчыць аб актуальнасці і сёння думкі аб тым, што «прыказкі і прымаўкі – гэта не толькі спадчына мінулага, але і жывая паэзія народа ў сучаснасці» [6, С. 216–217].

Настаўнік у час працы з прыказкамі на ўроках чытання можа выкарыстаць розныя прыёмы:

*1. Злучы часткі прыказак.* На дошцы запісаны ў два слупкі часткі прыказак, а вучям прапануецца злучыць першую частку з другой і растлумачыць сэнс прыказкі. Напр.:

| | |
|---|---|
| *1. Стары друг* | *ды малы розум (2).* |
| *2. Вялікая галава,* | *лепш за новых двух (1).* |
| *3. На чужыне* | *добрае і апавяданне (4).* |
| *4. На добрае запытанне* | *і камар загіне (3).* |
| *5. Бацькоў слухаць –* | *не паслухае і вялікі (6).* |
| *6. Не слухаў малы,* | *гора не знаць (5).* |

Суаднясенне зместу прыказкі са зместам мастацкага твора дазваляе больш яскрава падкрэсліць яго ідэйны змест і такім чынам паспяхова ажыццяўляць выхаваўчыя задачы чытання.

*2. Адкажы прыказкай.* Вучням прапануецца адказаць прыказкай на пытанне, дадзенае настаўнікам. Напр.:

1. Што трэба зрабіць, каб напіцца вады? *(Каб вады напіцца, трэба нахіліцца).* Пры тлумачэнні прыказкі вучням трэба падкрэсліць, што толькі старанны, працавіты чалавек дабіваецца поспеху. Названую прыказку і прыказкі з гэтай тэматычнай групы мэтазгодна выкарыстаць пры чытанні і аналізе твораў з раздзела «Хто хоча шчасліва жыць, той працу павінен любіць» (3 клас, сс. 47–70).

2. Які дождж бывае з вялікай хмары? *(З вялікай хмары малы дождж).* Тлумачэнне гэтай прыказкі, напрыклад, дазволіць ярка праілюстраваць змест верша Н. Гілевіча «Сябры ў паходзе» (3 клас, сс. 100–102). Пяць хлапчукоў выйшлі ў паход, і кожны нёс неабходныя ў паходзе рэчы. Але хутка Грышку прыйшлося аднаму несці ўсе рэчы, бо ўсім хлопчыкам – Цішку, Стасю, Лёўку і Янку – не хапіла фізічных сіл, каб несці рэчы. Змест верша Н. Гілевіча «Сябры ў паходзе», хоць і патрабуе захоўваць пры чытанні жартоўны настрой, не перашкаджае вучням зрабіць сур’ёзны вывад: турысту неабходна ўмець пераадольваць розныя непрыемнасці, цяжкасці, быць гатовым у любы час дапамагчы іншаму падарожнаму. Сапраўдным турыстам можна назваць толькі Грышку – такі вывад зробяць вучні.

3. Каго добра вучыць? *(Добра таго вучыць, хто хоча ўсё ведаць).* Напр., пры чытанні і аналізе верша М. Дуксы “Ці так чытала?” (3 клас, сс. 12–13), каб паказаць вучням, што дзяўчынцы не хапіла пры чытанні такіх якасцей, як стараннасць, уважлівасць, настойлівасць, вучням можна прапанаваць гэтую прыказку на заключным этапе працы з вершам.

*3. Аднаві прыказку (Успомні прыказку).* Вучням можна прапанаваць прыказкі, запісаныя на карткі, і даць заданне: знайсці слова, якое трэба замяніць у прыказцы:

*1. Вясенні дзень* ***месяц*** *корміць (год).*

*2. Усякай птушцы сваё* ***неба*** *міла (гняздо).*

*3. У вераб'я ёсць* ***дом*** *(сэрца).*

Пры такім падыходзе прыказкі абавязкова патрабуюць тлумачэння іх сэнсу, увага вучняў акцэнтавана на словы, якія змянілі.

4. Гульня *«Раскіданыя прыказкі».* Яна знайшла даволі шырокае прымяненне ў школьнай практыцы, мае некалькі варыянтаў выкарыстання. Вучням, напрыклад, прапануюцца словы ўперамешку, а яны складаюць з гэтых разрозненых слоў прыказку і тлумачаць сэнс: *добра, чалавеку, усюды, добраму (Добраму чалавеку ўсюды добра).* Растлумачыць сэнс гэтай прыказкі, на наш погляд, пажадана пры раскрыцці асноўнай думкі беларускай народнай казкі «Зайздросны дзядзька» (3 клас, сс. 9–11). Вучні спачатку знаходзяць прыказку ў падручніку па літаратурным чытанні і абгрунтоўваюць думку аб тым, што ў асяроддзі беларусаў заўсёды асуджалі прагнасць, зайздрасць. Важна данесці да вучняў, што добрага чалавека імкнуцца сустракаць шчыра, добра, ветліва. Гэтую народную мудрасць пацвярджае прыказка *Як ты да людзей, так і людзі да цябе.*

Вялікія магчымасці выкарыстання прыказак мае настаўнік у час чытання і аналізу мастацкіх твораў у 4 класе, асабліва раздзелаў «Чалавек і прырода», «Чалавек і Радзіма», «Быць на зямлі чалавекам» і інш. Так, у час чытання і аналізу верша В. Шымука «Лёгка нам нічога не даецца» (4 клас, сс. 47–48), каб падкрэсліць працавітасць і гасціннасць беларусаў, можна прапанаваць вучням прыказкі: *1. Госць на парог – радасць у хату* (прыход госця – вялікая радасць). *2. Госць на парог – гаспадыня за пірог* (гаворыцца ў асяроддзі беларусаў з адабрэннем пра гасціннасць і частаванне).

Выхаванню маральна-этычных якасцей, на наш погляд, будзе спрыяць і калектыўная гульня «Адкажы прымаўкай на пытанне»: 1. Як кажуць пра маўклівага, сумнага, скрытага, недаверлівага чалавека? *(Надзьмуўся як сава).* 2. Як гавораць пра чалавека, які глядзіць з недаверам на іншых? *(Глядзіць як сыч).* 3. Як гавораць пра чалавека, які толькі паказвае сваю важнасць, але не заўважае іншых? *(Насупіўся як індык).* 4. Як кажуць, калі чалавек настроены супраць іншых? *(Натапырыўся як верабей).* Вучні будуць больш актыўна ўдзельнічаць у гульні, калі да пытанняў прапанаваць пачаткі прымавак: *1. Надзьмуўся як… 2. Глядзіць як… 3. Насупіўся як… 4. Натапырыўся як… .*

На матэрыяле прыказак усебакова, трапна і поўна можна характарызаваць як станоўчыя, так і заганныя, адмоўныя рысы чалавека. Як трэба ставіцца да іншых людзей, асабліва старэйшых, як выхоўваць дзяцей, можна праілюстраваць, напрыклад, прыказкамі: *1. Шануй людзей, то і цябе пашануюць. 2. Старога паважай, малога павучай.*

Гэтыя прыказкі мэтазгодна прапанаваць вучням у час працы над зместам верша І. Муравейкі «Чаму мяне не хваляць?» (2 клас, сс. 90–91). Хлопчык, герой верша, сам хваліцца сваімі ўчынкамі. Але аўтар гаворыць сваім чытачам, што хлопчыку хваліцца няма чым, бо яго яшчэ ніхто не пахваліў за яго «рэкорды». Вучні дапамогуць хлопчыку адказаць на яго пытанне «Чаму мяне ніхто не пахваліў за гэта?», а настаўнік на матэрыяле прыказак сфармулюе з вучнямі правілы паводзін: *1. Дапамажы старому чалавеку, калі ён мае ў гэтым патрэбу. 2. Ветліва вядзі сябе з іншымі. 3. Ветлівы чалавек з дарослым (старэйшым) вітаецца першым. 4. Уважліва слухай субяседніка* і інш.

Прыказкі, як відаць з прыведзеных прыкладаў, характарызуюць розныя сітуацыі, разнастайныя бакі жыцця чалавека. Гэта каштоўны матэрыял, «залацінкі народнай мудрасці», прадуманае выкарыстанне якіх на ўроках будзе спрыяць выхаванню важнейшых маральна-этычных якасцей асобы вучня: працавітасці, умельства, кемлівасці ў жыцці, асабліва ў працы, гаспадарлівасці, стараннасці і асуджаць заганныя рысы – гультайства, ашуканства, несправядлівасць у адносінах з іншымі людзьмі, прагнасць, зайздрасць і інш.

Такім чынам, выкарыстанне разнастайных форм працы з прыказкамі ў час чытання і аналізу мастацкіх твораў на ўроках літаратурнага чытання дапаможа настаўніку паказаць спецыфіку і ўнікальнасць гэтага фальклорнага жанру, дазволіць вучыць малодшых школьнікаў падмацоўваць прыказкамі свае думкі, меркаванні аб змесце мастацкага твора, пашыраць уяўленні і слоўнікавы запас вучняў, авалодваць і асэнсоўваць вопыт, мудрасць і кемлівасць беларусаў і такім чынам далучаць вучняў да эстэтычных, маральна-этычных набыткаў і каштоўнасцей, да багатай фальклорнай спадчыны, якую захавалі і пакінулі нам нашы продкі.

**Список используемых источников**


1. Ярмольчык, Л.В. Добраму вучымся змалку. Развіццё маўлення на ўроках праз выкарыстанне прыказак і прымавак / Л.В. Ярмольчык // Пачатковая школа. – 2015. – № 8. – С. 20–23.

2. Латышава, Н.С. Гульні з прыказкамі і прымаўкамі / Н.С. Латышава // Пачатковая школа. – 2001. – № 11. – С. 25.

3. Канцавая, Г.М. Сказаў як связаў: Свята фразеалагізмаў, прыказак, прымавак / Г.М. Канцавая // Пачатковая школа. – 2007. – № 2. – С. 50–52.

4. Черногрудова, Е.П. Возможности использования русских народных пословиц на уроках / Е.П. Черногрудова // Начальная школа.– 2009. – № 1. – С. 29–32.

5. Жукоўская, С.Р. Звіні, мая светлая родная мова // Пачатковая школа. – 2016. – № 6. – С. 29–33.

6. Беларуская вусна-паэтычная творчасць: падр. для філал. спец. ВНУ / К.П. Кабашнікаў [і інш.]. – 2-е выд. – Мінск : Вышэйшая школа, 1988. – 415 с.


МГПУ им. И.П. Шамякина